Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка

Пытанні гісторыі, метадалогіі і методыкі выкладання

Зборнік навуковых артыкулаў
Выпуск першы

Мінск 1998

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Літаратура і крыніцы

1. *Богданович И.И.* Изучение в курсах истории 10-го класса внешней политики СССР и международных отношений после второй мировой войны (1945-1982 гг.). Мн., 1982.

2. *Вагин А.А.* Методика преподавания истории в средней школе. М., 1968.

3. *Вагин А.А.* Методика обучения истории в средней школе. М., 1972.

4. *Гора П.В.* Методические приемы и средства наглядного обучения истории в средней школе. М., 1971.

5. *Гора П.В.* Повышение эффективности обучения истории в средней школе. М., 1988.

6. Дидактика средней школы: Некоторые проблемы современной дидактики. М., 1975.

7. *Карцов В.Г.* Очерки методики обучения истории СССР в VIII-X классах. М., 1952.

8. *Лернер И.Я.* Дидактические основы методов обучения истории. М., 1981.

9. Методика преподавания истории в средней школе. М., 1986.

10. *Никифоров Д.Н., Скляренко С.Ф.* Наглядность в обучении истории и обществоведения. М., 1971.

11. *Стражев А.И.* Методика преподавания истории. М., 1964.

М.Бандзелікаў

Аб змесце і методыцы выкладання тэарэтыка-метадалагічных пытанняў крыніцазнаўства

Крыніцазнаўчая падрыхтоўка студэнтаў-гісторыкаў складаецца з засваення тэорыі і метадалогіі гэтай навукі, авалодання метадамі і прыёмамі вывучэння гістарычных крыніц і інфармацыйнай часткі, якая знаёміць з асаблівасцямі крыніц, якія захаваліся, або іх комплексамі па пэўнай гістарычнай навуцы, у пэўны гістарычны перыяд. У гэтым пераліку для прафесійнага станаўлення гісторыкаў вельмі важнае месца належыць тэорыі і метадалогіі крыніцазнаўства. Канешне, мае рацыю сцверджанне, што гісторыкамі становяцца не ў выніку чытання метадычных трактатаў, а ў працэсе працы разам з прафесіяналамі ў гэтай справе, як чаляднік з майстрам, а таксама ў выніку вывучэння грунтоўных гістарычных прац, аналізу іх на семінарскіх занятках пад кіраўніцтвам выкладчыка. Тым не меньш, гэта не

выключае таго, што, каб навучыць методыцы работы з гістарычнымі крыніцамі, неабходна прааналізаваць яе на ўзроўні тэорыі. Развіццё здольнасці задумвацца над агульнымі прынцыпамі, падыходамі, шляхамі работы з гістарычнымі крыніцамі можа толькі станоўча паўплываць на прафесійнае станаўленне студэнтаў-гісторыкаў.

Звяртанне да тэарэтычных праблем крыніцазнаўства важна і для тых, хто працуе са студэнтамі. Такая праца дазваляе зрабіць працэс навучання больш мэтанакіраваным. У гэтым сэнсе можна пагадзіцца з В.Медушэўскай, што "тэорыя, яе нарматыўныя палажэнні накіроўваюць працэс навучання прадмету, вызначаюць ягоны змест" [1, с.10]. Таму ўяўляецца важным і актуальным вызначэнне асноўных тэарэтыка-метадалагічных праблем, на якія павінна быць звернута ўвага пры выкладанні курса крыніцазнаўства.

Тэорыя крыніцазнаўства вырашае шэраг праблем, сярод якіх адной з важнейшых з'яўляецца вызначэнне прадмета і задач крыніцазнаўства. Нягледзячы на тое, што крыніцазнаўства як самастойная навуковая дысцыпліна мае векавую гісторыю, не існуе агульнапрынятага разумення яе прадмета і задач. Разглядаючы гэтае пытанне, неабходна паказаць эвалюцыю поглядаў гісторыкаў на прадмет і задачы крыніцазнаўства. Па магчымасці дакладна, канкрэтна акрэсліць межы, якія аддзяляюць крыніцазнаўства ад гістарычнага даследавання наогул і ад іншых гістарычных дысцыплін.

Вельмі працяглы час пад прадметам крыніцазнаўства разумелася распрацоўка метадаў выяўлення, вывучэння і выкарыстання гістарычных крыніц. Некаторыя савецкія гісторыкі, у тым ліку С.М.Каштанаў і А.А.Курносаў, прыйшлі да высновы, што крыніцазнаўства можа разглядацца як "тэорыя і методыка здабычы гістарычных фактаў". Гэта ж, па сутнасці, на іх думку, уваходзіць і ў прадмет гісторыі, таму "крыніцазнаўства практычна зліваецца з гістарычным даследаваннем" [2, с.175-176]. Шэраг гісторыкаў лічыць, што ў прадмет і задачы крыніцазнаўства ўваходзіць распрацоўка тэорыі і методыкі даследавання гістарычных крыніц, а таксама практычная работа па вывучэнню крыніцы [3]. Аднак пры агульным разуменні прадмета крыніцазнаўства не заўсёды дакладна даецца яго вызначэнне. Так, у падручніку па крыніцазнаўству гісторыі СССР пад рэдакцыяй І.Д.Кавальчанка крыніцазнаўства вызначаецца як гістарычная дысцыпліна, якая "распрацоўвае тэорыю і методыку вывучэння і выкарыстання гістарычных крыніц [4, с.3]. А.П.Пранштэйн і І.М.Данілеўскі лічаць, што прадметам вывучэння крыніцазнаўства "з'яўляецца ўся маса гістарычных

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

крыніц ва ўсёй паўнаце змешчанай у іх інфармацыі, разглядаемая як прадукт грамадскага развіцця" [5, с.43-44]. І.А.Булыгін вызначае прадмет даследавання крыніцазнаўства як "усю сукупнасць гістарычных крыніц ва ўсёй разнастайнасці іх формы і зместа" [6, с.30]. М.А.Варшаўчык у сваю чаргу лічыць, што "прадмет крыніцазнаўства складаюць заканамернасці ўтварэння крыніц і адлюстравання ў іх аб'ектыўнага працэсу грамадскага развіцця, іх функцыянавання ў гістарычным даследаванні, функцыянавання крыніцазнаўства ў сістэме гістарычнай навукі" [7, с.34]. На нашу думку, больш дакладным будзе вызначыць крыніцазнаўства як навуковую дысцыпліну, якая распрацоўвае тэорыю і методыку даследавання гістарычных крыніц, вядзе практычную работу па выяўленню крыніц і той навуковай інфармацыі, якую яны ўтрымліваюць. Гэтае вызначэнне ўводзіць у прадмет крыніцазнаўства прыкладную крыніцазнаўчую эўрыстыку. Тэарэтычныя яе аспекты ўвайшлі ў паняцце "тэорыя" і "методыка крыніцазнаўчага даследавання". У нашу задачу зараз не ўваходзіць разбіраць прыведзеныя вызначэнні прадмета крыніцазнаўства. Гэтыя вызначэнні могуць быць прыкладам эвалюцыі разумення прадмета крыніцазнаўства, пошуку канкрэтных межаў прадмета і задач крыніцазнаўства, яе суадносін з гісторыяй і іншымі гістарычнымі дысцыплінамі.

Вельмі важнай, але ў многім нявырашанай тэарэтычнай праблемай застаецца праблема класіфікацыі крыніц. Існуюць розныя падыходы да яе вырашэння [8, с.122-125], і ў навучальным працэсе неабходна паказаць студэнтам, што кожны з іх мае перавагі і недахопы. Можна пагадзіцца з тым, што на пэўным этапе развіцця крыніцазнаўства класіфікацыя крыніц, магчыма, сыграла сваю станоўчую ролю, але на сёняшні час усялякая класіфікацыя ўмоўная [9, с.7]. Адзначым, што пад час канкрэтнага даследавання пэўная класіфікацыя, а тым больш сыстэматызацыя, безумоўна, праводзіцца. Выбар асновы для яе ў вялікай ступені залежыць ад тэмы даследавання. У той жа час, павінны працягвацца спробы даць агульную класіфікацыю гістарычных крыніц. Такая праца будзе спрыяць выяўленню агульнага ў той ці іншай групе крыніц, а значыць - і фарміраванню агульных падыходаў, метадаў іх даследавання.

У лік важнейшых праблем, якія разглядае тэорыя крыніцазнаўства, уваходзяць заканамернасці ўзнікнення крыніц і адлюстравання ў іх з'яў і працэсаў гісторыі. Асноўнай, усеагульнай заканамернасцю з'яўляецца тое, што крыніца выступае як прадукт пэўных сацыяльных адносін, таго ці іншага

сацыяльнага асяроддзя, пэўных гістарычных падзей і працэсаў і, такім чынам, аб'ектыўна адлюстроўвае ўмовы свайго стварэння. Але аб'ектыўная інфармацыя, як правіла, перадаецца крыніцай праз суб'ект, таму атрымлівае суб'ектыўныя скажэнні. У сваю чаргу, успрыйманне гэтай інфармацыі гісторыкам таксама суб'ектыўнае, і яна зноў можа атрымаць скажэнні. У выніку крыніцы маюць як аб'ектыўную інфармацыю, так і скажоную, таму што інфармацыя дайшла да нас суб'ектывіраванай (праз асобу летапісца, аўтара мемуараў, успамінаў і г.д.). Скажэнні інфармацыі маглі ўзнікнуць незалежна ад волі аўтара або свядома. Гэтыя скажэнні, у той жа час, даюць нам аб'ектыўную інфармацыю аб асобе аўтара крыніцы, аб сучаснай яму духоўнай атмасферы, культурным асяроддзі, у якім ён жыў, а іншы раз - калі высвятляецца свядомы характар скажэнняў - аб палітычных, матэрыяльных або нейкіх іншых інтарэсах аўтара.

Рознага роду перапрацоўкі зыходнай інфармацыі, гэта значыць неаднаразовая яе суб'ектывацыя, вядуць да змяньшэння яе аб'ектыўнасці. Да суб'ектыўнага фіксавання першапачатковай інфармацыі дабаўляецца суб'ектыўнасць выбаркі, зводкі або іншай перапрацоўкі зыходнай інфармацыі. У сувязі з гэтым ускладняецца аналіз крыніц. Неабходна вызначыць інфармацыю не толькі ў момант яе першапачатковай фіксацыі, але і страты гэтай інфармацыі ў выніку яе пазнейшых перапарацовак. Асаблівая ўвага звяртаецца на тыя крыніцы, у якіх зафіксавана першапачатковая інфармацыя, і якія таму з'яўляюцца першакрыніцамі [8, с.117-118].

Усеагульная заканамернасць утварэння крыніцы і адлюстравання ў ёй гістарычнай інфармацыі ўключае ў сябе шэраг асобных заканамернасцей, такіх, напрыклад, як уплыў матываў стварэння крыніцы на яе змест і форму, адпаведнасць даставернасці і паўнаты інфармацыі крыніцы аб'ектыўным і суб'ектыўным магчымасцям яе аўтара, [illegible]

[illegible]

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Інфармацыя крыніцы, будучы перапрацаванай гісторыкам, ператвараецца ў навуковыя гістарычныя веды.

Наколькі гэта магчыма, выкарыстоўваецца ўся разнастайнасць інфармацыі крыніцы, усе яе "пласты". Але крыніца па сваім змесце бяднейшая за падзеі, якія яна адлюстроўвае. У ходзе крыніцазнаўчага даследавання, калі высвятляецца даставернасць і паўната крыніцы, яе сувязі з іншымі крыніцамі, фарміруецца комплекс крыніц і г.д., пераадольваецца непаўната і фрагментарнасць яе інфармацыі. Таму фактычныя веды, хаця яны і грунтуюцца на інфармацыі крыніц, па сваім змесце паўней за іх, больш аб'ектыўна адлюстроўваюць гістарычны працэс.

Разам з заканамернасцямі ўтварэння і функцыянавання крыніц тэарэтычнае крыніцазнаўства ўключае яшчэ адну групу заканамернасцей - функцыянаванне самаго крыніцазнаўства ў сістэме гістарычнай навукі. Гэтая група заканамернасцей адлюстроўвае адносіны крыніцазнаўства і гістарычнай навукі, вызначае месца крыніцазнаўства сярод іншых гістарычных дысцыплін. Пазнанне гэтых адносін, як і ўжо разгледжаныя тэарэтычныя праблемы, узбагачае разуменне прадмета і задач крыніцазнаўства.

Пры разглядзе гэтай праблемы неабходна звярнуць увагу на тое, што менавіта крыніцазнаўства высвятляе шырокае кола гістарычных фактаў. Дзеля вырашэння сваіх задач яно можа выкарыстоўваць вынікі і высновы, атрыманыя дапаможнымі гістарычнымі дысцыплінамі, а таксама вынікі і высновы агульнагістарычных даследаванняў. Напрыклад, дадзеныя палеаграфіі аб змяненнях графікі пісьма, аб матэрыяле помніка і г.д. выкарыстоўваюць для даціроўкі крыніц, у якіх гэтая дата адсутнічае або выклікае сумненні. Сама даціроўка адбываецца якраз у межах крыніцазнаўства [6, с.27-29]. Такім чынам, крыніцазнаўства закладвае падмурак з фактаў для гістарычных даследаванняў. Факты затым павінны быць падвергнуты інтэрпрэтацыі, і на падставе іх робяцца гістарычныя пабудовы.

Тэарэтычныя палажэнні кожнай канкрэтнай навукі, у тым ліку і крыніцазнаўства, набываюць характар рэгулятыўных, метадалагічных установак або прынцыпаў. Метадалогія крыніцазнаўства адпавядае крыніцазнаўчую тэорыю з крыніцазнаўчай прктыкай. Метадалогія крыніцазнаўства - гэта не толькі вучэнне аб прынцыпах і метадах пазнання і выкарыстання крыніц, але таксама і сукупнасць гэтых прынцыпаў,

рэалізуемых даследчыкамі на практыцы. Прынцыпы пазнання - гэта базавыя ўстаноўкі, правілы, выпрацаваныя навукай, якія грунтуюцца на веданні аб'ектыўных законаў, зафіксаваных тэорыяй. Калі тым ці іншым метадам можна карыстацца незалежна, паасобку, то метадалагічныя ўстаноўкі павінны пранізваць кожны метад, кожны даследчыцкі прыём.

У канкрэтна-навуковай метадалогіі вылучаюцца як асноўныя, светапоглядныя ў сваёй аснове, устаноўкі, так і асобныя прынцыпы, якія маюць больш вузкую накіраванасць. Асноўныя прынцыпы ўяўляюць сабою падмурак, на якім пабудавана ўся сістэма прынцыпаў канкрэтнай навукі. Колькасць асобных прынцыпаў практычна неабмежаваная. Чым багацей, чым больш распрацаваная тэарэтычная сістэма навукі, тым багацейшы і яе метадалагічны арсенал. Так, выснова аб тым, што крыніца, перш чым стаць ёю, выконвала сваё службовае прызначэнне, стала асновай прынцыпа вывучэння яе першасных сацыяльных функцый. Шматслойнасць інфармацыі крыніцы абумовіла прынцып павышэння яе інфармацыйнай задачы шляхам выяўлення ўсіх слаёў інфармацыі - прамой і ўскоснай, намеранай і ненамеранай і г.д. Па сутнасці, асобныя прынцыпы ў канчатковай ступені ёсць форма праяўлення асноўных прынцыпаў.

Разгледзім асноўныя метадалагічныя прынцыпы і іх функцыі ў крыніцазнаўстве. Прынцып аб'ектыўнасці. Прынцып аб'ектыўнасці абавязвае гісторыка прызнаваць аб'ектыўнасць крыніцы і магчымасць яе пазнання. Гэты прынцып абавязвае таксама адшукваць аб'ектыўную інфармацыю крыніцы і на яе аснове фарміраваць навуковыя факты.

Адным з важнейшых патрабаванняў прынцыпа аб'ектыўнасці з'яўляецца неабходнасць прыцягваць да вывучэння пэўнай гістарычнай з'явы або працэса столькі крыніц і такія крыніцы, якія дазваляюць на іх аснове атрымаць даставерныя навуковыя факты. Факты пры гэтым павінны знаходзіцца ва ўзаемнай сувязі і ўзаемнай залежнасці. Пад увагу павінны брацца ўсе факты без ягога-небудзь выключэння, калі яны адносяцца да разглядаемага пытання. Такім чынам фарміруюць сукупнасць фактаў. У працэсе фарміравання гэтай сукупнасці ўдзельнічаюць тэарэтычныя веды навукоўцаў, якія дазваляюць таксама вылучаць з атрыманых фактаў факты істотныя, важныя.

Фактарам, які забяспечвае аб'ектыўнасць, навуковасць вынікаў гістарычнага дасдедвання, з'яўляецца рэпрэзентатыўнасць крыніц гэтага даследавання. Паняцце рэпрэзентатыўнасці прыйшло ў крыніцазнаўства са

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

статыстыкі, дзе пад рэпрэзентатыўнасцю разумелася адпаведнасць вынікаў, атрыманых пры выбарчым вывучэнні крыніц, тым вынікам, якія маглі быць атрыманы пры суцэльным даследаванні ўсёй сукупнасці аб'ектаў. Не ўсе гістарычныя падзеі знайшлі адлюстраванне ў крыніцах, не ўсе ўзнікшыя калісьці крыніцы дайшлі да нашых дзён або даступныя для гісторыка. Таму паўстае пытанне: наколькі рэпрэзентатыўныя даступныя нам крыніцы, наколькі поўна яны адлюстроўваюць змест таго ці іншага працэсу. Галоўным крытэрыем рэпрэзентатыўнасці крыніцы або комплексу крыніц лічыцца магчымасць атрымаць на іх аснове сукупнасць навуковых фактаў.

Прабелы, якія могуць мець крыніцы ці комплексы крыніц, зніжаюць іх рэпрэзентатыўнасць. У гэтым выпадку прынцып аб'ектыўнасці патрабуе зрабіць пэўныя высновы. Перш-наперш, нельга не ўлічваць, што адсутнасць крыніц або пэўнай інфармацыі ў крыніцах аб нейкай з'яве, зусім не азначае, што гэтай з'явы не было. Таму прабелы, калі магчыма, ліквідуюцца шляхам удасканалення метадаў даследавання, шырокім выкарыстаннем ускоснай інфармацыі, інфармацыі ненамеранай, шляхам рэканструкцыі крыніц, якія адсутнічаюць, і г.д. Трэба таксама мець на ўвазе, што калі прабелы не могуць быць ліквідаваны, яны настолькі зніжаюць рэпрэзентатыўнасць комплексу крыніц, што распрацоўка гістарычнай тэмы можа весціся толькі ў гіпатэтычным плане або наогул яе распрацоўка становіцца немагчымай.

Прынцып аб'ектыўнасці не дазваляе прадузята ставіцца да крыніц, уключаючы адносіны да яе тэкста, - гэта значыць, што існуе "прэзумпцыя даставернасці крыніцы". Калі няма супярэчнасцяў у крыніцы, калі няма нічога, што указвала б на недаставернасць яе інфармацыі, значыць, гэтая інфармацыя даставерная. Адзначым аднак, што не ўсе гісторыкі пагаджаюцца з гэтым тэзісам [10, с.456-457]. Ну, і зразумела, прынцып аб'ектыўнасці абавязвае даследчыка дакладна перадаваць факты, не фальсіфікаваць іх.

Наступным метадалагічным прынцыпам у крыніцазнаўстве, які вылучаўся савецкімі гісторыкамі, з'яўляецца прынцып партыйнасці. Ён вызначаўся як "прынцып навуковага мыслення, які абавязвае даследчыка ўскрываць класавую прыроду крыніцы, выяўляць у грамадскіх адносінах, якія адлюстроўваюцца ім, дэтэрмінізаванасць класавымі адносінамі, ацэньваць інфармацыю крыніцы з класава-партыйных пазіцый" [7, с.55]. Прынцыпу партыйнасці, на наш погляд, надавалася занадта шырокае значэнне. Канешне, як момант гэты прынцып выражае тое, што на самой справе існуе ў прыродзе адлюстравання рэчаіснасці дастаткова шырокім колам крыніц і пад час

успрымання іх інфармацыі. Усё ж было б правільней гаварыць аб прынцыпе суб'ектыўнасці, які паглынае ў якасці асобнага моманту і прынцып партыйнасці.

Прынцып суб'ектыўнасці выражае той факт, што гістарычная інфармацыя даходзіць да нас звычайна суб'ектаванай. Успрыйманне інфармацыі таксама суб'ектыўнае. Аб гэтым ужо гаварылася вышэй. Таму на адлюстраванне інфармацыі і на яе ўспрыйманне накладваюць пэўны адбітак не толькі, а для вельмі многіх крыніц і не столькі партыйна-класавая прыналежнасць, колькі ўзровень адукацыі, культуры, асаблівасці выхавання, асаблівасці псіхікі, наогул менталітэт і шмат іншага, што характарызуе чалавека як сацыяльную істоту. Трэба ўлічваць, канешне, калі гэта мае месца, сацыяльна-класавыя адносіны. Але ж вялікі ўплыў на суб'ектывацыю гістарычнай інфармацыі аказваюць таксама рэлігійныя, нацыянальныя, групавыя, у рэшце рэшт, інтымныя адносіны.

Да асноўных метадалагічных прынцыпаў крыніцазнаўства адносяць прынцып гістарызму. У адносінах да гэтага прынцыпу, зноў жа, існуе рознасць падыходаў, ён таксама мае сваю гісторыю [11, с.230-235]. Прынцып гістарызма патрабуе разглядаць крыніцу ў канкрэтных гістарычных узаемасувязях (прычынна-следчых, сістэмных, часавых, прасторавых і г.д.) і ў развіцці. Згодна з прынцыпам гістарызму любая з'ява, у тым ліку і сама крыніца, павінна вывучацца ў сістэме, у якую яна была ўключана. Высвятляюцца яе пасторава-часавыя характарыстыкі, асобы, праз дзейнасць якіх гэтая з'ява рэалізоўвалася. Неабходна высвятляць не толькі агульна-гістарычныя, але і канкрэтныя ўмовы функцыянавання з'явы, якая вывучаецца.

З якой бы крыніцай гісторык не меў справу, ён [illegible]

Даследчык [illegible] ацаніць ролю, [illegible]

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

супадаць, а можа і не супадаць з той, якая давалася гэтай крыніцы ў час яе ўзнікнення. Абапіраючыся на прынцып гістарызму, мы вызначаем навізну інфармацыі крыніцы, яе непаўторнасць, а адсюль і каштоўнасць для пазнання адпаведнай гістарычнай падзеі.

Зразумела, што разгледжаныя асноўныя метадалагічныя прынцыпы знаходзяцца ў цеснай узаемнай сувязі. Некаторыя іх аспекты як бы ўзаеманакладаюцца, у нечым супадаюць. Трэба мець на ўвазе у пэўным сэнсе ўмоўнае іх вылучэнне для больш глыбокага разумення шляхоў пазнання гістарычнай рэчаіснасці, а таксама навучальных мэт.

З разгляду асноўных тэарэтыка-метадалагічных праблем пачынаецца знаёмства студэнтаў-гісторыкаў з крыніцазнаўствам як навуковай дысцыплінай. Галоўная мэта гэтай часткі курса крыніцазнаўства - даць агульнае ўяўленне аб тых тэарэтычных і метадалагічных праблемах, якія складаюць яе прадмет і вызначаюць задачы. Знаёмства з разгледжанымі праблемамі павінна пакінуць уражанне, што гэтыя праблемы, як і навука ў цэлым, маюць сваю гісторыю, маюць тэндэнцыі далейшага развіцця, што не існуе праблем, вырашаных раз і назаўсёды. У далейшым, калі будуць разглядацца метады крыніцазнаўчага даследавання, вызваныя тэарэтыка-метадалагічныя праблемы павінны актуалізавацца.

Літаратура і крыніцы

1. *Медушевская О.М.* Современное зарубежное источниковедение. М., 1983.

2. *Каштанов С.М., Курносов А.А.* Некоторые вопросы теории источниковедения //Исторический архив. 1962. № 4.

3. Гл.: *Булыгин И.А.* Предмет и задачи источниковедения. М., 1983. С.30; Варшавчик М.А, Источниковедение истории КПСС. М., 1989. С.34; Источниковедение истории СССР /Под ред. Ковальченко И.Д. М., 1973. С.3.; *Стрельский В.И.* Теория и методика источниковедения истории СССР. Киев, 1986. С.53.

4. Источниковедение истории СССР. М., 1973.

5. *ПронштейнА.П., Данилевский И.Н.* Вопросы теории и методики исторического исследования. М., 1986.

6. *Булыгин И.А.* Предмет и задачи источниковедения. М., 1983.

7. *Варшавчик М.А.* Источниковедение истории КПСС. М., 1989.

8. Гл.: *Ковальченко И.Д.* Методы исторического исследования. М., 1987.

9. Гл.: Профессионализм историка и идеологическая конъюнктура: Проблемы источниковедения советской истории. М., 1994.

10. Гл.: *Зимин А.А.* О методике изучения древнерусского летописания //Известия Академии Наук СССР. Сер. лит. и языка. 1974. №5.

11. Гл.: *Ракитов А.И.* Историческое познание. М., 1982.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ